Падтрымай "Вясну" на PATREON

Пераслед незалежных журналістаў не спыняецца

30.08.2018 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода слова



Тамара Шчапеткіна і Зміцер Лупач. Фотакалаж.

Журналістка-фрылансер **Тамара Шчапёткіна** з Бярозы 29 жніўня пакараная судом Бярозаўскага раёна штрафам 30 базавых велічынь.

Пап інфармацыі Беларускага Радыё Рацыя, ні суддзя **Наталля Мінчанка**, ні ўчастковы **Ігар Прыбышчук**, што складаў адміністрацыйны пратакол, не маглі адказаць, у чым канкрэтна абвінавачваецца Шчапёткіна.

У выніку блытаных паказанняў сведкі Ларысы Кузьміч, кароткіх фраз Прыбышчука “не знаю”, “ответить не могу”, Наталля Мінчанка прыйшла да высновы, што Шчапёткіна парушыла артыкул 22.9 КаАП. Што менавіта, не патлумачыла. Суд быў заангажаваны і яўна заказны, што вельмі абурыла прысутных на судзе з групы падтрымкі журналісткі.

Таццяна Тарасевіч:

– Мяне абурыла такое несправядлівае рашэнне суда. Канешне, я нічога і не чакала добрага, таму што не першы раз я на судзе. У нас душаць людзей, якія ўмеюць бараніць кагосьці, умеюць адстойваць сваё меркаванне.

Аляксандр Мех:


– Спадарыня Тамара вельмі дапамагла працаўнікам гэтага свінакомплексу. І, я думаю, яны ёй вельмі ўдзячныя за гэту дапамогу. Але ж дзяржава ацаніла гэту дапамогу па-іншаму. Інтарэсы народа не супадаюць з інтарэсамі дзяржавы.

Служба маніторынгу ГА "БАЖ" таксама паведамляе, што 28 жніўня незалежнаму журналісту з Глыбокага **Змітру Лупачу** прыйшла позва з'явіцца ў Браслаўскі РАУС. Як напісана ў позве, у сувязі з правядзеннем праверкі па факце выяўлення ў сетцы Інтэрнэт на інтэрнэт-сайце belsat.eu відэасюжэта, размешчанага 5 ліпеня.


Намеснік начальніка аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі Браслаўскага РАУС, маёр міліцыі **Вадзім Балтуноў** склаў на Змітра Лупача пратакол. У ім журналіста вінавацяць у парушэнні артыкула 35 Закона аб СМІ. І зноў незалежнага журналіста збіраюцца прыцягнуць да адказнасці па частцы другой артыкула 22.9 Кодэкса аб адміністрацыйных парушэннях, якая датычыцца толькі юрыдычных асобаў, а не фізічных.

Твитнуть









Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул


"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітвязняў знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі





АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў


Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY